# НАВУКА І МАСТАЦТВА ЯК СКЛАДАЛЬНІКІ ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА

***Р. Б. Смольскі,***
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар,*
*галоўны навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела*
*Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў*

Навука і мастацтва заўсёды займалі і зараз займаюць выключна важнае месца ў жыццядзейнасці дзяржавы і грамадства, а таксама і ў жыцці асобнага індывідуума. Мінулы 2016 Год культуры і бягучы 2017 Год навукі стымулююць усіх нас, хто мае прафесійнае дачыненне да гэтых адметных, калі не сказаць, унікальных сфер жыцця, больш уважліва, з улікам сістэмнага падыходу, прыгледзецца да набытых здабыткаў, напрацаванага вопыту, да існуючых навуковых і творчых праблем. Ад навукоўцаў чакаюць як абгрунтаваных прагнозаў на будучыню нацыянальнага мастацтва, так і новых ведаў, новых ідэй і канкрэтных прапаноў для практычнага вырашэння шматлікіх надзённых задач культурнага будаўніцтва.

У сувязі з гэтым хачу нагадаць, што сёлета спаўняецца 10 гадоў, калі ў Мінску адбыўся Першы з’езд вучоных Беларусі, на якім абмеркавалі надзённыя і стратэгічныя пытанні развіцця айчыннай навукі. На тым форуме кіраўнік нашай дзяржавы асабліва падкрэсліў, што «важнейшая функцыя беларускай навукі – захаванне і прымнажэнне культурных і духоўных традыцый нашага народа. Ніхто гэтага за нас не зробіць. Калі фізіка і матэматыка інтэрнацыянальныя і развіваюцца ва ўсім свеце, то беларуская культура, літаратура, гісторыя – гэта выключна наша ўласная каштоўнасць і наш уласны клопат» [1, с. 36].

Сёння варта згадаць пра яшчэ адзін прынцыпова важны тэзіс, які выказаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка на з’ездзе вучоных: «Нам трэба ўзмацніць навуку ў ВНУ і перш за ўсё за кошт умацавання яе сувязей з акадэмічнай» [Там жа, с. 38].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Варта адзначыць, што гэта даручэнне кіраўніка дзяржавы ва ўстановах вышэйшай адукацыі культуры і мастацтваў паспяхова выконваецца. Напрыклад, у 2010 г. у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (БДАМ) быў упершыню створаны Навукова-даследчы аддзел з мэтай удасканалення ўсёй сістэмы навуковай і педагагічнай дзейнасці ў акадэміі. Ужо сёння зусім відавочна, што гэта быў правільны і перспектыўны крок у агульным працэсе развіцця БДАМ як адной з вядучых навучальных установ у галіне прафесійнага мастацтва і гуманітарнай навукі.

Сучаснае беларускае мастацтва, як і творчая дзейнасць вядучых майстроў, а таксама маладых творцаў (дарэчы, сярод маладых даволі шмат сапраўдных радыкалаў, якім вельмі карціць здзейсніць сваю «культурную рэвалюцыю» ў тым ці іншым відзе мастацтва) насычаны самымі разнастайнымі з'явамі, падзеямі, трэндамі. Важна падкрэсліць: беларускае мастацтва прэзентуецца ў многіх відах, формах, жанрах, напрамках, якія, з аднаго боку, захоўваюць вядомыя прынцыпы нацыянальнага традыцыйнага развіцця, а з другога – адлюстроўваюць шматстайныя творчыя эксперыменты, якія абумоўліваюць у сваю чаргу няспынны пошук канцэптуальнага асэнсавання мастацтва будучыні.

Стан і ўзровень развіцця беларускага прафесійнага мастацтва на сучасным этапе знаходзіцца ў даволі складанай і супярэчлівай сітуацыі. Так, зусім відавочна назіраецца складаны працэс трансфармацыі ўнутрывідавога і міжвідавога формаўтварэння як традыцыйных (тэатр, выяўленчыя мастацтвы), так і тэхнагенных (кіно, тэлебачанне, камп'ютарная графіка і інш.) відаў мастацтва. Больш таго, нельга не заўважаць, што трансфармуюцца фактычна ўсе ўзроўні адзінай шматслойнай сістэмы мастацкай культуры Беларусі: спосаб мастацкага мыслення, сама мастацкая мова, форма і жанравая вызначанасць твораў тэатра, кіно, выяўленчых мастацтваў, дызайнерскай творчасці.

Разнастайная эксперыментальнасць і пошукавасць сучаснай мастацкай творчасці ў значнай ступені абумоўліваюцца сацыякультурнымі ўмовамі: агульнаплюралістычным светаразумен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нем, светаўспрыманнем і няўмольнай і відавочнай камерцыялізацыяй мастацкай і адукацыйнай сферы. Пошукі свайго месца ў рыначнай мадэлі дыктуюць творцам неабходнасць распрацоўваць сучасныя інавацыйныя формы мастацкай дзейнасці, вынікі якой былі б успрыняты і прыняты найперш масавым спажыўцом культурнага «прадукту».

Але тут адразу ўзнікае адна вельмі складаная акалічнасць: катэгорыі масавасці і камерцыйнасці, з аднаго боку, і высокай мастацкасці, вартага ідэйна-эстэтычнага ўзроўню, з другога, знаходзяцца ў непрымірымым супрацьстаянні. Яны спаборнічаюць, канфліктуюць, змагаюцца і ў выніку такой вострай барацьбы аслабляюць адна адну, што прыводзіць да пэўнага зніжэння прафесійнага ўзроўню сучаснага мастацтва.

Многія сур'ёзныя аналітыкі розных відаў і жанраў прафесійнага мастацтва даволі аднадушна адзначаюць, што апошнім часам мастацтва і наогул уся мастацкая культура паступова губляюць, так бы мовіць, сваю высокую гуманістычную і адметную мастацкасць і пераходзяць у так званую сферу паслуг. Ужо даволі працяглы час выразна назіраецца тэндэнцыя пэўнага распаду мастацкага працэсу на асобныя субкультуры, якія фарміруюцца па розных прыкметах: напрыклад, па характары творчых напрамкаў, пэўнай палітычнай мэты, вырашэння прагматычна-камерцыйных задач і гэтак далей.

Яшчэ адна адмысловая і ў пэўным сэнсе новая тэндэнцыя ў развіцці сучаснага беларускага мастацтва – гэта актыўная і своеасаблівая сінкрэтызацыя яго відаў, жанраў, спосабаў праяўлення, што абумоўлена бурным развіццём разнастайных інавацыйных тэхналогій, сучасных тэхнагенных магчымасцей мастацкай творчасці. Таму не толькі тэхнагенныя віды мастацтва, але і традыцыйныя ў якасці базавай асновы ўсё часцей і больш вынаходліва выкарыстоўваюць новыя электронныя тэхналогіі, на грунце якіх ствараюцца творы, напрыклад, выяўленчага мастацтва, камп'ютарнай графікі, вэб-дызайну і інш.

Нельга не заўважыць яшчэ адной вельмі адметнай прыкметы сённяшняга часу – паступовага фарміравання ў нетрах нашага грамадства філасофіі празмернага прагматызму, што ўвогуле

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыводзіць да ўсталявання так званага буржуазнага грамадства спажывання.

Гэтыя і многія іншыя акалічнасці і асаблівасці сённяшняга вірлівага часу ўносяць пэўныя карэктывы ў саму ідэалогію дзяржаўнай культурнай палітыкі. Напрыклад, зараз фарміруецца і пашыраецца працэс дзяржаўна-прыватнага партнёрства і супрацоўніцтва, ствараюцца пры дзяржаўных установах культуры і адукацыі разнастайныя «апякунскія саветы», развіваецца спонсарства і мецэнацтва. Адначасова ствараецца, хаця і вельмі марудна, адпаведная заканадаўчая і нарматыўная база для пашырэння камерцыйнай дзейнасці ў сферы мастацтва і творчай адукацыі.

Некаторая частка сённяшняй творчай грамадскасці нашай краіны схільна лічыць, што многія складаныя праблемы сучаснага беларускага мастацтва і мастацкай школы абумоўлены ў першую чаргу недастатковым бюджэтным фінансаваннем. Пэўныя падставы для такіх меркаванняў, безумоўна, ёсць. Але тут, у гэтай вялікай і далёка не новай праблеме пад умоўнай назвай «мастацтва і эканоміка», на самай справе ўсё значна глыбей, шырэй і што самае складанае і цяжкае, – больш супярэчліва і непрадказальна.

Па-першае, грошы самі па сабе не з'яўляюцца надзейнай гарантыяй нараджэння ў мастацтве сапраўдных шэдэўраў і творчых адкрыццяў. Паказальных сведчанняў такіх шмат. Па-другое, грошай, колькі б іх не выдзяляла дзяржава, ніколі не хапала і не будзе хапаць на рэалізацыю ўсіх амбіцыёзных творчых задум, ідэй, праектаў і эксперыментаў.

А па-трэцяе, і гэта, бадай што, самая трывожная і небяспечная тэндэнцыя для айчынных дзеячаў мастацтваў: асаблівасці развіцця сучаснай цывілізацыі заключаюцца ў тым, што багатыя дзяржавы з рыначнай эканомікай вельмі ахвотна перакладваюць большую частку фінансавых выдаткаў на саму культуру, грамадства, нарэшце, на саміх спажыўцоў культурнага прадукту – чытачоў, гледачоў, слухачоў.

Адным словам, праблема падтрымкі сферы культуры і мастацтва дзяржаўнымі фінансава-матэрыяльнымі рэсурсамі – праблема старадаўняя і адначасова вельмі актуальная. На жаль,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у нас адсутнічаюць грунтоўныя навуковыя распрацоўкі, якія тычацца вывучэння і абагульнення складанай комплекснай праблемы эканомікі ў сферы культуры і мастацтва.

Чаму так сталася – пытанне рытарычнае. Прывядзём некалькі красамоўных фактаў. Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі так і не ператварылася ў сапраўдны Цэнтр навуковай і творчай думкі. А навукова-даследчыя структуры творчых устаноў вышэйшай адукацыі (УВА) пакуль не валодаюць адпаведным кадравым, матэрыяльным і фінансавым патэцыялам для правядзення сістэмных і выніковых навуковых работ у гэтай складанай і надзённай праблематыцы – эканоміка і мастацтва.

Менавіта гэтымі акалічнасцямі і абумоўлена на сённяшні дзень відавочная адсутнасць прынцыпова важнага тэарэтычнага разумення аб’ектыўнай неабходнасці эканамічнай падтрымкі культуры і мастацтва як з боку дзяржавы, так і з боку прыватнага сектара эканомікі, фінансаў і іншых бізнес-структур нашага грамадства.

Выхад з такой далёка не простай сітуацыі для культурнай сферы ў рэаліях нашага рыначнага часу бачыцца ў неадкладным прыняцці шэрагу канкрэтных захадаў на адпаведным узроўні ўладных структур.

Напрыклад, ёсць ідэя, якая, вобразна кажучы, даўно лунае ў паветры: існуе пільная неабходнасць у стварэнні дзяржаўна-грамадскага Фонду падтрымкі нацыянальнага мастацтва і творчай адукацыі. (*У дужках заўважу: мы бачым, як літаральна «душаць» айчынных творцаў шматлікія замежная гастралёры і галівудскія баявікі ў кінатэатрах. Таму, лічу, тут трэба вучыцца ў некаторых еўрапейскіх краін, дзе даўно збіраюць адпаведныя падаткі на карысць сваіх нацыянальных культур. А чым мы горшыя?*)

Агульнавядома, што ў развітых еўрапейскіх культурах стан і ўзровень менавіта нацыянальных мастацкіх школ у значнай ступені вызначаюць агульны ўзровень усяго прафесійнага мастацтва. Гэта выключна важная акалічнасць еўрапейскага культурнага жыцця склалася ў мінулым стагоддзі і працягваецца ў XXI ст.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Будзем заўсёды памятаць і свядома разумець, што ў развіццё сучаснага беларускага мастацтва розных відаў і жанраў вялікі ўклад зрабіла менавіта нацыянальная мастацкая школа. Яна працягвае і развівае свае лепшыя творчыя, педагагічныя, вучэбна-метадычныя і метадалагічныя прынцыпы і традыцыі, абумоўленыя ў тым ліку і ўсёй грунтоўнай сістэмай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Так, у БДАМ заўсёды прынцыпова ставіліся і сёння ставяцца да захавання і развіцця лепшых традыцый акадэмічнай школы (пад лепшымі традыцыямі разумеюцца перш за ўсё рэалістычныя асновы айчыннага мастацтва, яго гуманістычная скіраванасць), а таксама да дакладнай і паслядоўнай арганізацыі ўсёй сістэмы вучэбна-выхаваўчага працэсу на сучасным узроўні.

Безумоўна, асаблівасць Беларускай акадэміі мастацтваў і іншых творчых УВА, найперш БДУКМ і БДАМ (у іх сценах адбываецца, так бы мовіць, «штучная» падрыхтоўка будучых майстроў у розных відах прафесійнага і аматарскага мастацтва, а таксама дасведчаных мастацтвазнаўцаў, педагогаў) прымушае шукаць свае канцэптуальныя падыходы ў распрацоўцы і паслядоўнай рэалізацыі вучэбных планаў і праграм з улікам існуючых агульных дзяржаўных стандартаў у галіне падрыхтоўкі кадраў.

Асноўныя мэты і задачы творчых УВА абумоўлены аб'ектыўнымі патрабаваннямі часу. Па-першае, УВА культуры і мастацтваў павінны стаць трывалым падмуркам і асновай бесперапыннасці мастацкай адукацыі. Шматлікія і разнастайныя пачатковыя школы мастацтваў, ліцэі, каледжы, вучэльні, падрыхтоўчыя курсы, таксама адпаведныя курсы перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі (гэта ў першую чаргу тычыцца педагагічных і навуковых кадраў) – і так ... усё жыццё. Творцы, навукоўцы, педагогі, як вядома, павінны (вымушаны!) настойліва вучыцца штодзённа, іншага ў творчых і навуковых сферах не дадзена!

Па-другое, трэба глыбока ўсвядоміць яшчэ адну выключна важную задачу: творчыя УВА павінны рыхтаваць не проста дасведчанага прафесіянала высокай «пробы», а творцу адукава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага і маральна дасканалага ў самым шырокім сэнсе гэтага значэння.

Па-трэцяе, перад творчымі УВА стаіць надзвычай важная і актуальная задача – практычна асвоіць прынцып шматузроўненасці вышэйшай адукацыі. Гэта значыць, што ў студэнтаў павінна быць рэальная магчымасць свядомага выбару ў атрыманні вышэйшай адукацыі з адпаведнымі дакладнымі і абгрунтаванымі тэрмінамі навучання і дакументамі. Зразумела, што вучэбныя планы пры гэтым абапіраюцца на сучасныя нацыянальныя дзяржаўныя і еўрапейскія адукацыйныя стандарты, якія забяспечваюць уладальнікам беларускіх дыпломаў безумоўнае міжнароднае прызнанне.

З мэтай вырашэння ўсіх гэтых «старых» і новых праблем і задач устойлівага развіцця сучаснай нацыянальнай мастацкай школы мэтазгодна абмеркаваць і распрацаваць шэраг пэўных канкрэтных захадаў.

Так, напрыклад, наспела вострая неабходнасць падрыхтаваць і зацвердзіць новую дзяржаўную комплексную праграму «Творчыя кадры Беларусі XXI стагоддзя», у якой будуць вызначаны асноўныя напрамкі развіцця ўсёй сістэмы беларускай мастацкай адукацыі на бліжэйшую і больш аддаленую перспектыву. І такая праграма не будзе супярэчыць галіновай праграме «Кадры» на 2018–2022 гг., а наадварот, узбагачаць новымі падыходамі і прынцыпамі ў арганізацыі такой работы.

Тут неабходна канцэнтрацыя высілкаў і намаганняў усіх зацікаўленых міністэрстваў, ведамстваў і ўстаноў у справе развіцця адукацыйнай сферы ў галіне культуры і мастацтва. Для гэтага трэба ў першую чаргу:

– прыняць агульны дакумент-пагадненне аб узаемадзеянні паміж Міністэрствам культуры і Міністэрствам адукацыі нашай краіны ў сферы мастацкай адукацыі;

– стварыць міжведамасны каардынацыйны Савет па мастацкай адукацыі пад патранатам Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь для аператыўнага вырашэння ўсіх праблем і пытанняў, што рэгулярна ўзнікаюць у адукацыйнай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так, адна з наспелых праблем – падрыхтоўка і перападрыхтоўка педагагічных кадраў у галіне мастацкай адукацыі, іх адпаведны статус і г. д.

Вырашэнне агучаных мною праблем, ідэй і задач – гэта, безумоўна, доўгатэрміновы, сістэмны і напружаны працэс для ўсіх зацікаўленых удзельнікаў будаўніцтва нашай незалежнай і суверэннай дзяржавы, яе багатай і адметнай нацыянальнай мастацкай культуры.

Калісьці Бертольд Брэхт сказаў, што ўсе віды мастацтваў служаць найвялікшаму з мастацтваў – мастацтву жыць на зямлі.

А ў XXI ст., на мой погляд, нарадзілася адно важнае ўдакладненне і дапаўненне гэтай мудрай, амаль біблейскай тэзы: мастацтву жыць на зямлі вучыць не толькі гуманістычнае мастацтва, але і гуманітарная навука, у тым ліку і навука пра мастацтва.

Думаю, варта ўсім нам пра гэта добра памятаць у нашых паўсядзённых клопатах, турботах, творчых і навуковых пошуках.

---

*1.* Первый съезд ученых Республики Беларусь : сб. материалов, Минск, 1–2 нояб. 2007 г. / редкол.: А. Н. Косинец (председатель) [и др.]. – Минск : Белорус. наука, 2007. – 704 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ДАСЯГНЕННІ МУЗЕЯЛОГІІ І ПРАКТЫКА МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ: ПЕРСПЕКТЫВЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

***М. А. Бяспалая,***
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Каштоўнасныя і ідэялагічныя арыенціры кожнага грамадства, яго духоўная культура і веды аб акаляючай прасторы з цягам часу прыкметна змяняюцца. Аб гэтым выразна сведчыць эвалюцыя музейнай справы, вытокі якой у форме збіральніцтва